Падтрымай "Вясну" на PATREON

У Віцебску 27 сакавіка асудзілі адзінаццаць чалавек

28.03.2017 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў



Леанід Свецік у судзе 27 сакавіка.

У дапаўненне інфармацыі пра асуджэнне і арышт 27 сакавіка ў Віцебску праваабаронцаў Леаніда Свеціка і Кастуся Мардвінцава, стала вядома яшчэ пра дзесятак адміністрацыйных працэсаў над удзельнікамі акцыі пратэсту. “Вясну” аб гэтым праінфармаваў мясцовы журналіст.

У панядзелак 27 сакавіка ў Віцебску прайшлі судовыя працэсы над людзьмі, якія былі затрыманы напярэдадні, 25 і 26 сакавіка, падчас масавых акцый, што праходзілі ў горадзе.



У суд былі дастаўлены грамадскія актывісты, журналісты, праваабаронцы і проста грамадзяне, якія выпадкова, ці наўмысна апынуліся ў цэнтры горада ў гэтыя дні. Па выніках праведзеных судовых працэсаў былі вынесеныя розныя рашэнні: ад 20 базавых велічынь да 15 сутак адміністрацыйнага арышту.

На думку незалежных назіральнікаў, рашэнні судом Кастрычніцкага раёна Віцебска выносіліся зыходзячы не з актыўнасці удзельнікаў акцый, а хіба што з статусу затрыманых. Інакш як можна растлумачыць, што простым грамадзянам, напрыклад, **Аліне Сільчанцы, Ганне Сцяпура** давалі па 20 базавых (абедзве асуджаныя суддзёй Уладзімірам Царыкавым), а праваабаронцам **Леаніду Свеціку**, (асуджаны суддзёй Жураўковай Таццянай) і **Канстанціну Мардвінцаву** (асуджаны суддзёй Грабоўскай Інай) далі па максімуму - па 15 сутак?



Акрамя гэтага былі асуджаныя: актывіст Партыі БНФ **Леанід Аўтухоў** - 15 сутак арышту (суддзя Макарэвіч Ігар), актывіст Руху "За Свабоду" **Хрыстафор Жаляпаў** - 12 сутак арышту (суддзя Будрэвіч Сяргей), журналіст радыё "Рацыя" **Сізінцаў Арцём** - 10 сутак арышту (суддзя Міхасёва Валянціна), праваабаронца **Ірына Траццякова** - 30 базавых велічынь (суддзя Жураўкова Таццяна), грамадзяне Рэспублікі Беларусь **Камароўскі В.Ю.** - 13 сутак арышту (суддзя Макарэвіч Ігар), па асуджаным **Аскер** (суддзя Міхасёва Валянціна) і **Гром** (суддзя Жарыкава Алеся) няма інфармацыі.



Усе затрыманыя былі пакараныя за парушэнне артыкулу 23.34 Кодэксу аб адміністрацыйных правапарушэннях (парушэнне парадку арганізацыі або правядзеньня масавых мерапрыемстваў). Адметнай рысай усіх судовых працэсаў было адсутнасць сведкаў, а доказная база будавалася выключна на відэазапісах.

Нагадаем, яшчэ адзін затрыманы ў гэтыя дні ў Віцебску праваабаронца **Павел Левінаў** з ізалятара часовага ўтрымання патрапіў у шпіталь.

Твитнуть




Вясна. Правы чалавека ў …
9 958 "Нравится"
ВЯСНА
Нравится
Свяжитесь с нами


СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ
Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул
"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)
Чатырох жыхароў Паставаў асудзілі да "хатняй хіміі" за фотаздымак з Маршу (дапоўнена)
Заява праваабаронцаў аб прызнанні 20 палітычных зняволеных
WWW.GAZETABY.CO


ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА
У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

"Усё зроблена, каб паралізаваць тваю волю", — былая палітзняволеная Вольга Класкоўская

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

"Мораць голадам і холадам". Новыя сведчанні пра катаванні і акалічнасці смерці Вітольда Ашурка ў ПК-17



ГАЛОЎНАЕ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023



#ВалюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі трэмін па крымінальнай справе

Мужчыну асудзілі на два гады калоніі па двух дыфамацыйных артыкулах

Паўтара года калоніі прысудзілі экс-кандыдату ў прэзідэнты Андрэю Дзмітрыеву

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

Дырэктару газеты "Белорусы и рынок" Канстанціну Залатых прысудзілі чатыры гады калоніі

Да пяці гадоў калоніі. Асудзілі палітвязняў, якія вывесілі нацыянальныя сцягі Беларусі і Украіны

Дайджэст вызваленых: 12 палітвязняў у сакавіку цалкам адбылі тэрміны і выйшлі на волю

"Могуць з'яўляцца злачынствамі супраць чалавечнасці". Што азначае гэтая фармулёўка ў дакладзе

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023







ПАРТНЁРСТВА

РАДЫЯ

kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

СЯБРОЎСТВА

EENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

VOICE OF BELARUS

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

